# Выстаўка твораў Маякоўскага

Працоўныя сталіцы Беларусі — Мінска шырока адзначаюць 15-годдзе з дня смерці вялікага совецкага паэта В. В. Маякоўскага. У Дзяржаўнай бібліятэцы імені Леніна, абласной бібліятэцы імені Пушкіна і ўрадавай бібліятэцы імені Горкага арганізаваны выстаўкі твораў Маякоўскага. На іх прадстаўлены паэмы, п'есы, вершы аб Радзіме, абаронныя вершы, літаратура «Акон РОСТА» і г. д.

9 красавіка ў бібліятэцы імені Горкага была прачытана лекцыя кандыдатам філасофскіх навук маёрам Галенчанка на тэму: «Маякоўскі—палкі патрыёт нашай Радзімы». Адбылася цікавая лекцыя для партыйнага, совецкага і комсамольскага актыва на тэму: «Рускі патрыёт і таленавіты паэт совецкай эпохі В. В. Маякоўскі», якую прачытаў кандыдат філасофскіх навук Гутараў. У кабінеце літаратуры дзяржаўнага педагагічнага інстытута імені Горкага рыхтуецца літаратурная віктарына на тэму—Маякоўскі аб Радзіме.

Лекцыі і вечары, прысвечаныя жыццю і творчасці вялікага паэта, адбудуцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце і іншых вышэйшых навучальных установах, а таксама ў няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах, на прадпрыемствах і ва ўстановах горада.

(БЕЛТА).